**БЕЛАРУСЬ**

Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы

**Справаздача за 2009 год аб свабодзе веравызнання ў краінах свету**
**26 кастрычніка 2009 года**

Канстытуцыя абвяшчае роўнасць рэлігій і дэнамінацый перад законам, аднак таксама ўтрымлівае палажэнне, якое абмяжоўвае свабоду веравызнання.
Урад па-ранейшаму абмяжоўваў свабоду веравызнання ў адпаведнасці з палажэннямі прынятага ў 2002 годзе закона аб веравызнанні і падпісанага ў 2003 годзе пагаднення з Беларускай Праваслаўнай Царквой (БПЦ), што ёсць часткай Рускай Праваслаўнай Царквы (РПЦ) і адзінай афіцыйна прызнанай у краіне праваслаўнай дэнамінацыяй. Нягледзячы на тое, што ў краіне няма дзяржаўнай рэлігіі, пагадненне надае БПЦ прывілеяваны статус. Улады вымушалі многія рэлігійныя суполкі чакаць доўга, часам на працягу некалькіх гадоў, рашэнняў, што тычыліся рэгістрацыі ці рэстытуцыі ўласнасці. Улады пераследавалі і штрафавалі сябраў некаторых рэлігійных суполак, асабліва тых, што лічыліся праваднікамі іншаземнага культурнага ўплыву або ацэньваліся як палітычна заангажаваныя. Адмоўнае стаўленне да пратэстантаў было асабліва выразным. Улады перашкаджалі дзейнасці замежных місіянераў, святароў і гуманітарных работнікаў, звязаных з цэрквамі; напрыклад, іх дэпартавалі, адмаўлялі ім у візах і анулявалі выдадзенныя візы. За перыяд, ахоплены гэтай справаздачай, сталі больш значнымі абмежаванні, што тычацца дзейнасці замежных святароў.
Некаторыя прадстаўнікі грамадства канструктыўна працавалі дзеля забеспячэння свабоды веравызнання, але таксама былі выпадкі дыскрымінацыі і пераследу па прыкметах рэлігійнай прыналежнасці, перакананняў і веравызнання, у тым ліку шматлікія акты вандалізму і падпалы культавых месцаў, будынкаў і помнікаў.
Урад Злучаных Штатаў Амерыкі ўздымае пытанні свабоды веравызнання на сустрэчах з уладамі ў межах сваёй агульнай палітыкі, скіраванай на абарону правоў чалавека.

Частка 1. Рэлігійная дэмаграфія

Тэрыторыя краіны - 80154 квадратныя мілі, насельніцтва – 9,7 мільёна чалавек. Паводле дадзеных па стане на студзень 2009 года, атрыманых ад Апарата ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (АУСРН), каля 60 адсоткаў беларусаў лічаць сябе вернікамі, а сярод іх прыкладна 80 адсоткаў адносяцца да БПЦ, 14 адсоткаў прылічаюць сябе да рымска-каталіцкай царквы, 4 адсоткі адносяць сябе да ўсходніх рэлігійных груп (у тым ліку мусульман , крышнаітаў, бахаяў), а аб’яднанні пратэстантаў (у тым ліку адвентысты сёмага дня, хрысціяне веры апостальскай і лютэране), стараверы і Сведкі Іеговы складаюць 2 адсоткі. З тых, хто вызначае сябе як праваслаўны ці рыма-каталік, адпаведна 18 і 50 адсоткаў рэгулярна наведваюць набажэнствы. Ёсць таксама вызнаўцы грэка-каталіцызму і прыхільнікі праваслаўных суполак, што не належаць да БПЦ. Паводле яўрэйскіх суполак, яўрэямі лічаць сябе ад 30 да 50 тысяч чалавек. Бальшыня яўрэяў не з’яўляюцца актыўнымі вернікамі.
Паводле дадзеных АУСРН па стане на студзень 2009 года, у краіне 3218 рэлігійных арганізацый 25 рэлігійных канфесій і дэнамінацый, у тым ліку 3062 зарэгістраваныя

рэлігійныя суполкі і 156 рэспубліканскіх і канфесійных рэлігійных аб'яднанняў (кляштараў, братэрстваў, суполак місіянераў і г.д.). Сюды ўвайшлі 1473 прыходы Беларускай Праваслаўнай Царквы, 500 прыходаў евангельскіх хрысціян, 467 рымска-каталіцкіх, 269 прыходаў евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 72 прыходы адвентыстаў сёмага дня, 54 прыходы хрысціян Поўнага Евангелля, 32 стараверскіх, 29 іудзейскіх, 27 лютэранскіх, 26 прыходаў Сведкаў Іеговы, 25 мусульманскіх, 21 прыход нова-апостальскай царквы, 17 прыходаў прагрэсіўных іудзеяў, 14 грэка-каталіцкіх, 9 прыходаў хрысціян веры апостальскай, 6 крышнаіцкіх і 5 бахайскіх, 5 прыходаў Царквы Хрыста, 4 прыходы Царквы Ісуса Хрыста і Святых Апошніх Дзён (мармонскіх), 2 месіянскіх, 1 прыход рэфармісцкай царквы, 1 прыход прэсвітэран, 1 армянскі апостальскі, адзін лацінска-каталіцкі і адзін прыход Іаганскай царквы.

Частка 2. Ступень захавання ўладамі свабоды веравызнання

Прававыя і палітычныя ўмовы

Канстытуцыя абвяшчае роўнасць рэлігій і дэнамінацый перад законам, аднак таксама ўтрымлівае абмежавальнае палажэнне, паводле якога адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі "рэгулююцца з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". АУСРН рэгламентуе ўсе пытанні, звязаныя з веравызнаннем.
Закон аб веравызнанні ад 2002 года сцвярджае вызначальную ролю праваслаўнай царквы ў развіцці традыцый беларускага народа, а таксама гістарычную важнасць аб'яднанняў, што прытрымліваюцца так званых "традыцыйных вераванняў": каталіцызму, іудаізму, ісламу і евангельскага лютэранства. Аднак паняцце "традыцыйныя вераванні", што ўзгадваецца ў законе, не распаўсюджанае на некаторыя рэлігійныя суполкі, напрыклад, беспапоўскія стараверскія і кальвінісцкія, чые карані ў гісторыі краіны сягаюць у 17-е стагоддзе.
Улады адзначаюць наступныя рэлігійныя святы як нацыянальныя: праваслаўнае Свята Божага Нараджэння, праваслаўны Вялікдзень, каталіцкі/пратэстанцкі (заходні) Вялікдзень, Радуніцу (Памінальны аўторак ці Мірскі Вялікдзень), праваслаўны дзень памінання продкаў, і каталіцкае/пратэстанцкае (заходняе) Свята Божага Нараджэння.
Нягледзячы на тое, што закон ад 2002 года дэкларуе свабоду веравызнання, ён утрымлівае абмежавальныя палажэнні, што падвышаюць узровень кантролю з боку ўладаў. Паводле закона, усе папярэдне зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі павінны былі прайсці перарэгістрацыю да 2004 года. Закон забараняе дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных суполак. У дадатак, ён дазваляе дзейнасць рэлігійнай суполкі толькі ў межах адміністратыўнай адзінкі, у якой яна зарэгістраваная, і ўсталёўвае складаныя патрабаванні да рэгістрацыі, якія некаторым і "традыцыйным", і "нетрадыцыйным" суполкам выканаць цяжка.
Закон ад 2002 года патрабуе, каб усе рэлігійныя групы атрымлівалі папярэдні дазвол урада на ўвоз і распаўсюд літаратуры, забараняе замежнікам узначальваць рэлігійныя арганізацыі і пазбаўляе рэлігійныя суполкі права ствараць навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі святароў.
Закон ад 2002 года ўсталёўвае трохузроўневую структуру рэлігійных арганізацый: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя аб'яднанні і рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні.

Рэлігійныя суполкі ці мясцовыя рэлігійныя арганізацыі-адзінкі павінны налічваць не менш як дваццаць сябраў ва ўзросце не маладзей за 18 гадоў, што жывуць у дадзенай мясцовасці. Рэлігійныя аб'яднанні павінны мець не менш як 10 суполак (прычым адна з іх павінна мець прысутнасць у краіне на працягу не менш як 20 гадоў) і могуць быць заснаваныя толькі рэлігійным аб'яднаннем нацыянальнага узроўню. Рэлігійныя аб'яднанні нацыянальнага ўзроўню ствараюцца толькі ў тым выпадку, калі дзейныя рэлігійныя суполкі ёсць у бальшыні з 6 абласцей краіны.

Рэлігійная суполка павінна прадаставіць спіс імёнаў заснавальнікаў, іх адрасы, інфармацыю аб грамадзянстве і асабістыя подпісы, а таксама копіі ўстаноўчага статута, пратакол установчага сходу аб'яднання і дазвол ад мясцовых уладаў, што пацвярджаў бы права на размяшчэнне ў пэўным месцы і карыстанне маёмасцю, названай ва ўстаноўчых дакументах. Заявы на рэгістрацыю разглядаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі (для суполак за межамі Мінска) і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам. Суполка, якая вызнае рэлігію, што раней не была "вядомая" ўраду, павінна таксама падаць інфармацыю пра сваю рэлігію. За перыяд, ахоплены гэтай справаздачай, ніводную рэлігійную суполку, што не была раней "вядомая", не зарэгістравалі.

Рэлігійнае аб'яднанне павінна падаць спіс сябраў свайго кіруючага органа з біяграфічнымі звесткамі, дакумент, што пацвярджае права аб'яднання на размяшчэнне ў пэўным месцы, і пратаколы ўстаноўчага сходу аб'яднання. Рэлігійныя аб'яднанні валодаюць выключным правам ствараць духоўныя навучальныя ўстановы, запрашаць замежных грамадзян для працы з рэлігійнымі суполкамі і ствараць кляштары. Усе заяўкі на заснаванне аб'яднанняў і рэспубліканскіх аб'яднанняў неабходна падаваць у АУСРН. У 2008 годзе ўлады зарэгістравалі 85 рэлігійных суполак. Паводле хрысціянскіх суполак, закон жорстка абмяжоўвае іх дзейнасць, пазбаўляе свабоды веравызнання і легалізуе крымінальны пераслед асобаў за рэлігійныя перакананні.

Пагадненне, заключанае ў 2003 годзе паміж БПЦ і ўрадам, гарантуе БПЦ самастойнасць ва ўнутраных справах, свабоду ў правядзенні рэлігійных абрадаў і іншай дзейнасці, а таксама асаблівыя адносіны з дзяржавай. Пагадненне прызнае ролю БПЦ у «фармаванні духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа». Яно заклікае ўрад і БПЦ да супрацоўніцтва пры правядзенні палітыкі ў розных сферах, у тым ліку ў сферах адукацыі, развіцця, аховы культурнай спадчыны, а таксама ў сферы бяспекі. Хоць у пагадненні сцвярджаецца, што яно не абмяжоўвае рэлігійную свабоду іншых канфесій, яно заклікае ўрад і БПЦ змагацца супраць неназваных "псеўдарэлігійных структур, якія ўяўляюць небяспеку для асобы і грамадства". У дадатак, БПЦ валодае эксклюзіўным правам выкарыстоўваць слова "праваслаўны" ў сваёй назве, а таксама выкарыстоўваць у якасці свайго сімвала выяву крыжа Ефрасінні, святой-апякункі краіны.

27 сакавіка 2009 года Мітрапаліт БПЦ Філарэт заклікаў улады да эфектыўнага рэгулявання інтэрнэту і кантралявання доступу да яго "небяспечных рэсурсаў". Прэзідэнт Лукашэнка адзначыў шырокае грамадскае прызнанне БПЦ і яе ўнёсак у захаванне "міру і духу талерантнасці" паміж прадстаўнікамі розных канфесій, а таксама паабяцаў па-ранейшаму яе падтрымліваць.

Абмежаванні свабоды веравызнання

Улады абмяжоўвалі свабоду веравызнання як непасрэдна, так і ўскосна. Урад прымяняў законы, што абмяжоўваюць свабоды набажэнстваў, слова і сходаў; дзяржаўную рэгістрацыю неабходна атрымліваць да пачатку рэлігійнай дзейнасці. Часам урад быў

адказны за дзеянні, звязаныя з рэлігійнай непавагай і нецярпімасцю, і рэгулярна не выкарыстоваў магчымасці выступіць з асуджэннем такіх дзеянняў. Урад часта называў "нетрадыцыйнымі" суполкі, што не лічыў традыцыйнымі, і шырока выкарыстоўваў тэрмін "секта" ў дачыненні да такіх суполак, хоць гэтае вызначэнне і не з'яўляецца афіцыйным.
Падчас сустрэчы з кіраўніцтвам міністэрства ўнутраных спраў 29 чэрвеня 2009 года прэзідэнт Лукашэнка зрабіў надзвычай зневажальныя заўвагі ў дачыненні да баптысцкіх суполак. Ён абвінаваціў міністэрства ў "злачынным праколе" пры "падборы персанала і ў ідэалагічнай працы" і адзначыў, што некаторыя супрацоўнікі праваахоўных органаў з'яўляюцца "актыўнымі" сябрамі "сумнеўных рэлігійных сект" і перадаюць сакрэтную інфармацыю сваім пратэстанцкім "братам" і паплечнікам. Прэзідэнт Лукашэнка таксама выступіў з асуджэннем спробаў "уцягнуць у рэлігійныя секты" студэнтаў і выкладчыкаў Акадэміі МУС.
29 чэрвеня 2009 года Цэнтр духоўнай асветы і сацыяльнага служэння пры БПЦ правёў дыскусію на тэму "Секты ў сучасным пратэстантызме". Сярод выступоўцаў быў прадстаўнік АУСРН, які назваў аб'яднанне пяцідзесятнікаў найвялікшай у краіне "сектай", якая ёсць "агрэсіўнай", "палітызаванай" і якая адмоўна ўздзейнічае на вернікаў. Пратэстанты і праваабаронцы выказалі глыбокую занепакоенасць гэтымі публічнымі "зневажальнымі" для пяцідзесятнікаў заўвагамі, здольнымі справакаваць міжканфесійную напружанасць і варожасць.
Многія "традыцыйныя" і "нетрадыцыйныя" рэлігійныя групы па-ранейшаму сутыкаліся са складанасцямі ў вырашэнні пытанняў арэнды, набыцця нерухомай маёмасці, рэгістрацыі маёмасці як культавай, пабудовы цэркваў і вяртання сабе рэлігійнай маёмасці, што знаходзіцца пад кантролем дзяржавы. Суполкі таксама сутыкаліся з праблемамі пры пераафармленні нерухомай маёмасці з жылога фонду для яе выкарыстання як культавай; жыллёвы кодэкс дазваляе выкарыстоўваць такую маёмасць для нежыллёвых мэтаў толькі пасля атрымання дазволу мясцовых выканаўчых і адміністратыўных органаў. У выніку некалькі пратэстанцкіх цэркваў і "нетрадыцыйных" груп апынуліся ў тупіку: ім не даюць дазвол на выключэнне сваёй маёмасці з жылога фонду для выкарыстання як культавай, таму што яны не зарэгістраваныя як рэлігійныя суполкі, і яны не могуць прайсці рэгістрацыю, не маючы юрыдычнага адраса. Такія групы часта вымушаны былі збірацца, парушаючы гэтыя патрабаванні, або сустракацца ў дамах сваіх прыхажан.

Пастанова ўрада прадугледжвае канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых грамадскіх мерапрыемстваў. Адміністрацыі некаторых грамадскіх аб'ектаў нерухомасці, спасылаючыся на гэтую пастанову, скасавалі ці адмовіліся падоўжыць дамовы з рэлігійнымі групамі на выкарыстанне памяшканняў. На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, рэлігійным групам, асабліва незарэгістраваным, па-ранейшаму было складана арэндаваць памяшканне для сходаў. Найбольш ад гэтай пастановы цярпелі пратэстанцкія суполкі, таму што ў іх менш уласных памяшканняў, і ім даводзілася іх арэндаваць, калі колькасць сябраў занадта вялікая, каб сутракацца ў прыватных дамах.

Урад часта абмяжоўваў права на мірныя сходы, звязаныя з рэлігійнай дзейнасцю. 14 снежня 2008 года АМАП ненадоўга затрымаў Сяргея Луканіна і дваіх яго паплечнікаў за правядзенне евангелічнага набажэнства ў цэнтры Мінска. Міліцыянты папярэдзілі Луканіна аб крымінальнай адказнасці за "несанкцыянаваную рэлігійную дзейнасць" і

прымусілі прысутных разыйсціся; траіх затрыманых адпусцілі без прад'яўлення абвінавачанняў. Улады, у прыватнасці супрацоўнікі ідэалагічных упраўленняў, скіроўвалі свае захады супраць незарэгістраваных рэлігійных суполак (гл. частку "Парушэнні...").

8 студзеня 2009 года ў Бабруйску суд пастанавіў аштрафаваць актывіста Аляксандра Ермаліцкага на суму 62 даляры за правядзенне ў сябе дома несанкцыянаванай малітвы 5 снежня 2008 года.

16 верасня 2008 года ў Барысаве ўлады адмянілі фестываль хрысціянскай музыкі за некалькі мінут да пачатку, нягледзячы на тое, што папярэдне дазволілі яго правядзенне. Пазней улады даслалі ліст, у якім абвесцілі, што адмена фестываля была выкліканая "недахопамі" ў першапачатковым звароце па дазвол на яго правядзенне.

Улады ўзмацнілі захады (у тым ліку ў выглядзе дэпартацый, адмоў у візах і скасавання выдадзеных віз) супраць замежных місіянераў, святароў і гуманітарных работнікаў. Урад па-ранейшаму прымяняў узмоцненыя абмежаванні ў дачыненні да дзейнасці замежных святароў, прынятыя ў студзені 2008 года. Звяртацца ў АУСРН па дазвол на запрашэнне замежнага святара маюць права толькі зарэгістраваныя рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні, і атрыманне дазволу неабходнае для таго, каб рэлігійныя дзеячы з-за мяжы мелі права пачынаць весці службы ў мясцовых прыходах, выкладаць ці вучыцца ў мясцовых установах, прымаць удзел у дабрачыннай дзейнасці ці займацца пашырэннем замежных кантактаў рэлігійных суполак. АУСРН мае права не выдаваць такія дазволы і не даваць пры гэтым тлумачэнняў. Гэтыя палажэнні закранулі, ў першую чаргу, рымска-каталіцкую і пратэстанцкія дэнамінацыі, прывялі да змяншэння колькасці рымска-каталіцкіх святароў у краіне і абмежавалі гуманітарныя і дабрачынныя праекты заходніх пратэстанцкіх цэркваў.
19 снежня 2008 года Тадэвуш Кандрусевіч, старэйшы іерарх рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі, выказаў сур'ёзную занепакоенасць у сувязі з адвольнай высылкай польскіх святароў і недастатковай колькасцю святароў у краіне ў сувязі з тым, што іх падрыхтоўка ў мясцовых установах патрабуе працяглага тэрміну. 9 снежня на парламенцкім паседжанні прадстаўнік АУСРН Марына Цвілік паскардзілася на тое, што каталіцкая адукацыя займае занадта шмат часу і што святары, запрошаныя каталіцкай царквой з-за мяжы, - гэта людзі іншага менталітэту, іншай культуры, якія не арыентуюцца ў палітычных і сацыяльных працэсах, што ідуць у краіне. Па яе меркаванні, улады паспяхова спынілі бескантрольную дзейнасць замежных святароў, і яна назвала недахоп каталіцкіх святароў "праблемай, што застаецца нявырашанай".
У снежні 2008 года тром рымска-каталіцкім святарам – Яну Браноўскаму, Яну Скончнаму і Анджэю Краўчыку – адмовілі ў рэгістрацыі, нягледзячы на тое, што яны служылі ў краіне на працягу многіх гадоў. Паводле АУСРН, гэтая адмова не з'яўляецца забаронай на ўезд, але святары нібыта не здолелі "авалодаць"беларускай мовай і таму не маюць дастатковай кваліфікацыі, каб служыць у беларускіх парафіях. Таксама ў снежні 2008 года АУСРН забараніў тром польскім манахіням і яшчэ аднаму святару служыць у Мінска-Магілёўскай дыяцэзіі, а польскаму святару Збігневу Грыгарцэвічу, які праслужыў у Беларусі 3 гады, не было дазволена працягваць рэлігійную дзейнасць. Улады праігнаравалі хадайніцтва і 400 подпісаў, пададзеныя парафіянамі Грыгарцэвіча ў яго падтрымку, а таксама адмовіліся назваць прычыны адмовы.

15 кастрычніка 2008 года ў аэрапорце памежная служба затрымала і затым дэпартавала, не даўшы тлумачэнняў, Веніяміна Бруха, пратэстанцкага пастара з Украіны. У 1991 годзе ў Мінску Брух выступіў заснавальнікам поўнаевангельскай “Царквы Ісуса Хрыста”.

Назіральнікі выказвалі занепакоенасць тым, што адсутнасць адзінай сістэмы ўрадавых патрабаванняў да выканання змененых у 2006 годзе візавых працэдур уплывае на ўмовы жыцця і дзейнасці місіянераў. Як і на працягу ранейшых справаздачных перыядаў, атрыманню дазволу на наведванне краіны замежнымі рэлігійнымі дзеячамі часта папярэднічалі працяглыя бюракратычныя працэдуры. Закон патрабуе, каб замежныя місіянеры і клерыкі атрымлівалі гадавыя візы на шматразовы ўезд з дазволам займацца “рэлігійнай дзейнасцю”. Арганізацыя, што запрашае замежнага святара, павінна падаць пісьмовую заяву ў АУСРН з пазначэннем тэрміну і мэты візіта. Нават калі візіт мае нерэлігійныя мэты (напрыклад, дабрачынныя), наведвальнікі павінны атрымаць візу і дазвол АУСРН. АУСРН дае адказ на працягу тэрміну да 20 дзён. Не існуе механізму, які дазваляў бы абскардзіць яго рашэнне.
Улады часта распытвалі замежных місіянераў і гуманітарных работнікоў, а таксама мясцовых грамадзян, што працуюць з імі, пра крыніцы і выкарыстанне іх фінансавых сродкаў. Паступалі вартыя даверу звесткі пра тое, што супрацоўнікі службы бяспекі вялі назіранне за гэтымі замежнымі грамадзянамі.
7 лютага 2009 года міліцыя дэпартавала дваіх датчан-бізнэсоўцаў і гуманітарных работнікаў за прапаведванне і незаконную рэлігійную дзейнасць; ім забаранілі прыяжджаць у краіну на працягу аднаго года. Іх затрымалі ў Гомелі на набажэнстве ў царкве “Жывая вера”. 20 лютага 2009 года ў Гомелі раённы суд не задаволіў іх хадайніцтва аб скасаванні пастановы аб дэпартацыі.

Арцыбіскупу Йовану, прымасу Святой Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (СБАПЦ) і актывісту кампаніі за свабоду веравызнання па-ранейшаму не дазвалялі наведаць краіну; урад не прызнае СБАПЦ.
Урад не дазваляе замежным місіянерам прымаць удзел у рэлігійнай дзейнасці па-за межамі ўстаноў, якія іх запрасілі. Пераход у іншую рэлігійную арганізацыю, у тым ліку ў іншы прыход, патрабуе папярэдняга атрымання дазволу ўладаў.
Органы ўнутраных спраў могуць вымушаць замежных святароў з’ехаць з краіны, адмовіўшы ім у рэгістрацыі або не выдаўшы дазвол на часовае знаходжанне. Улады могуць дзейнічаць самастойна або на падставе рэкамендацый іншых урадавых устаноў.
Закон забараняе “падрыўную дзейнасць” замежных арганізацый і адкрыццё прадстаўніцтваў замежных арганізацый, дзейнасць якіх вядзе да“этнічнай, рэлігійнай ці расавай варожасці” або можа “негатыўна ўплываць на фізічнае і духоўнае здароўе людзей”.
Замежных грамадзян, што афіцыйна знаходзяцца ў краіне з нерэлігійнымі мэтамі, могуць папярэдзіць ці дэпартаваць у выпадку іх ўдзелу ў рэлігійнай дзейнасці. 26 чэрвеня 2009 года міліцыя дэпартавала нігерыйскага пастара Сымона Мілонгу пасля таго, як 23 чэрвеня ў Бабруйску ён прыняў удзел у набажэнстве ў царкве “Свет надзеі”. Мілонгу, які мае від на жыхарства ў Расіі, абвінавацілі ў незаконным перасячэнні беларускай мяжы.

Закон не забараняе грамадзянам прапаведаваць і адкрыта казаць пра свае рэлігійныя перакананні, але на практыцы ўлады часта ўмешваліся ў іх дзейнасць, а таксама каралі

некаторых грамадзян, што прапаведавалі ад імя як зарэгістраваных, так і незарэгістраваных рэлігійных суполак. Улады рэгулявалі ўсе аспекты прапаведавання і распаўсюду літаратуры.
На працягу перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай, улады сачылі за дзейнасцю мірных рэлігійных суполак, асабліва тых, якія яны успрымалі як "іншаземныя" або як "культы". Паводле вартых даверу крыніц, прадстаўнікі службаў дзяржаўнай бяспекі часта наведвалі пратэстанцкія набажэнствы, каб весці назіранне. 15 красавіка 2009 года прадстаўнік АУСРН абвесціў, што ўлады не толькі ўважліва адсочваюць і спыняюць "незаконную" рэлігійную дзейнасць суполак, напрыклад, Баптысцкай рады цэркваў ці Царквы Аб'яднання, але таксама канфіскавали ў апошняй матэрыялы для экспертызы, каб прадухіліць "парушэнні" ёй "правоў і свабод чалавека" і "пагрозу псіхалагічнаму і фізічнаму дабрабыту грамадзян".

Урад па-ранейшаму выкарыстоўваў падручнікі, што спрыяюць рэлігійнай нецярпімасці, асабліва ў адносінах да "нетрадыцыйных" рэлігійных суполак. Лідэры пратэстанцкай супольнасці крытыкавалі як дыскрымінацыйныя ў адносінах да пратэстантаў фармулёўкі падручніка "Асновы бяспекі жыццядзейнасці", у прыватнасці, раздзел пад назвай "Беражыцеся сект". Раздзел змяшчае параграф, які расказвае вучням пра такія "секты" як адвентысты сёмага дня, Царква Марыі, Белае брацтва і Сведкі Іеговы. Міністэрства адукацыі, не зважаючы на пратэсты рэлігійных суполак, па-ранейшаму выкарыстоўвала падручнік "Чалавек, грамадства, дзяржава", у якім суполкі пратэстантаў і Харэ Крышна называюцца "сектамі". Ніводная з гэтых кніг не была перавыдадзеная да канца перыяду, ахопленага гэтай справаздачай.
Улады цярпліва ставяцца да антысемітызму, аднак сітуацыя палепшылася на працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай. Колькасць праяваў антысемітызму за справаздачны перыяд скарацілася, але расследаванні вяліся неэфектыўна і толькі зрэдчас. Былі таксама праявы дзейнасці неанацыстаў, якія ўлады звычайна кваліфікавалі як хуліганства (гл. частку 3).
У лютым 2009 года ў Мастах райвыканкам не дазволіў мясцовым грамадскім актывістам адкрыць мемарыяльную дошку на месцы былога яўрэйскага гета ў горадзе Лунна, што знаходзіцца непадалёк. Актывісты хацелі ўсталяваць дошку з надпісамі па-беларуску і на іўрыце ў дадатак да той дошкі па-расейску і на іўрыце, што ўжо ёсць. Па меркаванні актывістаў, апошняя знаходзіцца занадта далёка ад межаў былога гета.
У абмежаваным аб'ёме адбывалася рэстытуцыя культавай уласнасці. Паводле Магілёўскай суполкі хабад-любавіцкіх іудзеяў, у траўні 2009 года прэзідэнт Лукашэнка даручыў мясцовым уладам разгледзець пытанне аб вяртанні суполцы старой сінагогі. Для рэстытуцыі ўласнасці, канфіскаванай падчас савецкага і нацысцкага перыядаў, не існуе заканадаўчай базы. Закон абмяжоўвае рэстытуцыю ўласнасці, якая выкарыстоўваецца ў культурных, спартыўных ці асветніцкіх мэтах. Урад не вяртаў будынкі, калі не меў месца для перасялення тых, што іх займае. Напрыклад, большасць хадайніцтваў яўрэйскай супольнасці аб вяртанні сінагогаў, што выкарыстоўваюцца ў якасці тэатраў, музеяў, спартовых комплексаў і піўной, не былі задаволеныя.
Лідэры мясцовых і міжнародных яўрэйскіх арганізацый звярнуліся да прэзідэнта Лукашэнкі з хадайніцтвам аб захаванні драўлянай сінагогі 19-га стагоддзя ў Любані; раней, у красавіку 2009 года, мясцовыя ўлады Любані знішчылі падобную сінагогу на падставе таго, што яна нібыта была ў кепскім стане і "страціла сваю гістарычную і

культурную каштоўнасць”. Актывісты кампаніі, скіраванай на захаванне спадчыны, таксама пратэставалі супраць разбурэння сінагогі і заклікалі ўлады адзначыць яе месца мемарыяльным знакам.
Па стане на канец справаздачнага перыяду не быў вырашаны.лёс былога кляштара бернардынаў, што ў цэнтры Мінску. 10 верасня 2008 года прадстаўнік АУСРН зноў публічна абвясціў пра намер вярнуць кляштар вернікам, заўважыўшы пры гэтым, што перамяшчэнне дзяржаўных архіваў у іншае месца зойме шмат часу.

Замахі на свабоду веравызнання
На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, урад па-ранейшаму рабіў замахі на свабоду веравызнання, скіраваныя супраць сябраў некаторых рэлігійных груп. Як і раней, найчасцей рэлігійных лідэраў вінавацілі ў арганізацыі ці правядзенні несанкцыянаванага сходу, парушэнні, прадугледжаным законам, што абмяжоўвае свабоду сходаў. Закон дазваляе грамадзянам збірацца ў прыватных дамах для малітвы, але ён абмяжоўвае правядзенне ў такіх месцах рытуалаў, абрадаў ці цырымоній і патрабуе папярэдняга атрымання дазволу ад мясцовых уладаў. На працягу справаздачнага перыяду пратэстантаў і праваслаўныя суполкі, што не належаць да БПЦ, часта штрафавалі ці папярэджвалі за незаконную дзейнасць.
22 чэрвеня 2009 года ў Мінску гарадская пракуратура распачала крымінальную справу супраць Яўгена Волкава, актывіста Царквы Аб’яднання (царквы Муна), па абвінавачаннях у дзейнасці ад імя незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі. На стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, расследаванне па гэтай крымінальнай справе, першай справе такога кшталту, працягвалася.
17 чэрвеня 2009 года ў горадзе Горкі мясцовыя ўлады пастанавілі аштрафаваць на суму 60 даляраў мясцовага актывіста-пратэстанта Пятра Маланачкіна за распаўсюд рэлігійнай і іншай друкаванай прадукцыі. Яны таксама разабралі кніжны стэнд, што знаходзіўся каля яго дома, і забралі экзэмпляры Бібліі, Дэкларацыі правоў чалавека ды іншыя выданні.
28 траўня 2009 года паступіла паведамленне пра тое, што баптысцкага пастара Мікалая Палешчука аштрафавалі на 745 даляраў, а яго калегу Яўгена Ягорава папярэдзілі за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. 20 сакавіка 2009 года ў Бабруйску мясцовы ідэолаг пагражаў Палешчуку крымінальным пераследам у тым выпадку, калі яго суполка, якой шматразова адмаўлялі ў рэгістрацыі, будзе і надалей сустракацца для набажэнстваў у жыллёвых памяшканнях. 4 сакавіка 2009 года Палешчука папярэдзілі і загадалі яму знішчыць рэлігійную літаратуру, канфіскаваную 11 студзеня 2009 года з вулічнай хрысціянскай бібліятэкі ў Асіповічах, арганізаванай Палешчуком і яго паплечнікамі. Паступіла паведамленне пра тое, што пазней Вярхоўны суд адмяніў судовыя пастановы і загадаў канфіскаваць, а не знішчыць друкаваныя рэлігійныя матэрыялы.
12 траўня 2009 года ў Магілёве раённы суд пастанавіў аштрафаваць Людмілу Бацюк, каардынатара Беларускай хрысціянскай сацыяльнай арганізацыі “Дом на скале”, на 50 долараў за арганізацыю незаконнай рэлігійнай суполкі і ўцягванне грамадзян у незаконную рэлігійную дзейнасць. Абвінавачанні сталі вынікам несанкцыянаванага выкарыстання Бацюк “хрысціянскага падыходу” да арганізацыі праграмы рэабілітацыі алкаголікаў і наркаманаў.

20 сакавіка 2009 года ў Шчучыне міліцыя затрымала на 2 гадзіны шасцярых баптыстаў за выкананне гімнаў і распаўсюд хрысціянскай літаратуры. Усе друкаваныя матэрыялы былі канфіскаваныя "для экспертызы".
2 сакавіка 2009 года Вярхоўны суд пастанавіў пакінуць дзейнымі патрабаванні да рэгістрацыі рэлігійных суполак, а таксама адхіліць скаргу пастара-пяцідзесятніка Валянціна Баравіка на пастанову, паводле якой ён быў аштрафаваны ў чэрвені 2008 года за правядзенне ў сябе дома ў Мастах незаконнага набажэнства і арганізацыю дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі.
20 лютага 2009 года ў Лельчыцах раённы суд пастанавіў аштрафаваць рымска-каталіцкага святара Віталя Мысонава на 37 даляраў за ўсталяванне крыжа блізу горада ў 2008 годзе.
22 студзеня 2009 года ў Любані раённы суд пастанавіў арыштаваць на тры месяцы мусульманіна Міхаіла Міхаленю за ўхіленне ад службы ў войску і нявыплату звязанага з гэтым штрафа. У 2007 годзе Міхаленю пастанавілі аштрафаваць на 735 даляраў за ўхіленне ад прызыву ў войска па падставе рэлігійных перакананняў; па яго меркаванні, у войску няма ўмоваў для выканання мусульманскіх рытуалаў.
6 студзеня 2009 года ўлады папярэдзілі 15 баптыстаў. 20 снежня 2008 года міліцыя затрымала іх і канфіскавала рэлігійную літаратуру з іх вулічнай бібліятэкі ў Кобрыне.
10 лістапада 2008 года Беларускі камітэт дзяржаўнай бяспекі (БКДБ) падрабязна дапытаў сябра царквы "Новае жыццё" Сяргея Вашкевіча наконт яго ранейшай дабрачыннай дзейнасці і ў сувязі з выбухам, што адбыўся ў Мінску 4 ліпеня 2008 года. Вашкевіч адмовіўся праходзіць дактыласкапію і падпісваць пратаколы допытаў.
5 жніўня 2008 года службоўцы БКДБ правяліператрус дома ў пратэстанцкага пастара Эрнэста Сабілы і канфіскавалі яго кампутар.
30 ліпеня 2008 года ў горадзе Свіслач мясцовыя ўлады адмовіліся разгледзець шматлікія заклікі да адмены свайго рашэння, прынятага ў чэрвені 2008 года, забараніць правядзенне царквой пяцідзесятнікаў "Благодать" сакрамэнту хросту ў возеры, на адкрытым паветры. У адмове ўлады спасылаліся на "неадназначную рэакцыю", якую магло б выклікаць у пераважна праваслаўнага і каталіцкага насельніцтва правядзенне суполкай "Благодать" сакрамэнту хросту.
25 ліпеня 2008 года ў Гродна раённы суд пастанавіў аштрафаваць пастара-баптыста Юрыя Краўчука на 250 даляраў за правядзенне нядзельнага малельнага сходу дома без афіцыйнага дазволу.
23 ліпеня 2008 года кіраўнік Ружанскага сельсавета і мясцовыя службоўцы органаў бяспекі ўважліва назіралі за жалобным набажэнствам, якое праводзіў святар БАПЦ Іаан Грудніцкі, і беспаспяхова спрабавалі яго спыніць
18 і 19 ліпеня 2008 года ў Івянцы на сустрэчы каталіцкай моладзі міліцыя затрымала актывістаў партыі "Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя" Мікалая Дземідзенку і Кастуся Шыталя і канфіскавала ў іх рэлігійныя матэрыялы. Абодвух адпусцілі без складання пратакола, аднак Дземідзенку трымалі ў пастарунку да наступнай раніцы.
Пасля доўгага перапынку 19 лістапада 2008 года Вышэйшы гаспадарчы суд аднавіў слуханні па прыпыненай на няпэўны тэрмін у 2007 годзе справе прымусовага продажу нерухомай маёмасці царквы "Новае жыццё", якую ўлады адмовіліся зарэгістраваць як культавую. 13 студзеня 2009 года суд прыняў рашэнне пакінуць дзейным першапачатковую пастанову, паводле якой царква "Новае Жыццё" пазбаўлялася права ўласнасці на дадзены аб'ект. 5 сакавіка 2009 года пададзеная царквой апеляцыя была адхіленая, і рашэнне пакінутае без зменаў. 16 сакавіка 2009 года гарадская адміністрацыя

прапанавала царкве іншы ўчастак зямлі памерам адзін акр; памер участка, што ад пачатку належаў царкве "Новае жыццё", - чатыры акры. 9 сакавіка 2009 года падчас інтэрв'ю на дзяржаўным тэлебачанні АУСРН абвінавацiў царкву "Новае жыццё" ў тым, што яна парушае правы дзяцей на адукацыю, адмаўляючыся вызваліць участак, на якім планавалася пабудаваць дзіцячы садок ці школу. 8 траўня 2009 года Ганчарэнка абвесціў, што суполка царквы "Новае жыццё" прыняла адзінагалоснае рашэнне адмовіцца ад прапановы адміністрацыі. 14 траўня 2009 года царква "Новае жыццё" атрымала ад мясцовай раённай камунальнай службы і адмовілася выканаць загад вызваліць будынак да першага чэрвеня 2009 года. У лісце ад 9 чэрвеня 2009 года мінскія гарадскія ўлады паўтарылі сцверджанні, зробленыя АУСРН 9 сакавіка, і заклікалі суполку перагледзець сваю пазіцыю па прапанаванаму ўчастку зямлі. Па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, царква "Новае жыццё" не вызваліла будынак.

Прымусовы зварот у веру

Не паступала паведамленняў ні пра прымусовы зварот у веру, ні пра непаўналетніх грамадзян ЗША, якія былі б выкрадзеныя або незаконна вывезеныя са Злучаных Штатаў, ні пра адмову прадаставіць магчымасць такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты.

Паляпшэнні і станоўчыя змены ў сітуацыі з захаваннем свабоды веравызнання

Бюракратычныя працэдуры былі працяглымі, але ўлады зрабілі некаторыя станоўчыя крокі ў справах рэстытуцыі ўласнасці, выдзялення зямельных участкаў і выдачы дазволаў на пабудову новых рымска-каталіцкіх касцёлаў. 18 траўня 2009 года Гальшанскі сельсавет вярнуў частку будынка былога францысканскага кляштара Гродненскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі. 8 ліпеня 2008 года Магілёўская парафія Св. Антонія атрымала дазвол на пабудову касцёла пасля чатырохгадовых узгадненняў і спробаў атрымаць афіцыйны дазвол. У 2008 годзе Мінская парафія Маці Божай Ружанцовай атрымала дазвол на пабудову касцёла. Паводле справаздачы АУСРН па стане на чэрвень 2009 года, на працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, улады вярнулі шэсць іншых і культавых будынкаў БПЦ і адзін – іудзейскай супольнасці.

15 красавіка 2009 года на сустрэчы з арцыбіскупам Тадэвушам Кандрусевічам прэзідэнт Лукашэнка зноў паабяцаў аказваць падтрымку рымска-каталіцкай царкве, адзначыўшы, што "высока ацэньвае місію каталіцкай царквы".

У Докшыцах гарадскія ўлады аднавілі на мясцовых яўрэйскіх могілках мемарыяльны камень, пра знікненне якога паведамлялася 5 красавіка 2009 года. Улады паабяцалі прыняць дадатковыя захады, каб перадухіліць вандалізм і абараніць помнік.

У снежні 2008 года ўлады зарэгістравалі шэсць з сямі суполак "Міжнароднага таварыства свядомасці Харэ Крышна".

19 снежня 2008 года ў Мінску раённы суд забараніў як "экстрэмісцкія" і "антысеміцкія" выданні, што заклікаюць да "этнічнай і рэлігійнай нянавісці і гвалту", 13 рэлігійных кніг і іншыя друкаваныя матэрыялы, што публікавала і распаўсюджвала Мінская кампанія "Хрысціянская ініцыятыва". Генеральная пракуратура адклікала ліцэнзію кампаніі на выдавецкую дзейнасць і канфіскавала 50 000 асобнікаў гэтых матэрыялаў.

20 кастрычніка 2008 года прэзідэнт Лукашэнка прысутнічаў на цырымоніі з нагоды 65-тых угодкаў знішчэння Мінскага гета. Прэзідэнт адзначыў унёсак яўрэяў у перамогу ў Другой

сусветнай вайне і аддаў даніну павагі ахвярам-яўрэям. Ён таксама паабяцаў супрацьдзейнічаць любым праявам нацызму ці рэлігійнай варожасці. Рэлігійныя суполкі высока ацанілі падтрымку ўладаў у справе арганізацыі і правядзення цырымоніі.
У кастрычніку 2008 года ў Магілёве яўрэйская суполка здолела ўзвесці помнік ахвярам халакосту, калі мясцовыя ўлады далі дазвол у адказ на чацвёрты зварот суполкі.
15 верасня 2008 года і зноў 29 красавіка 2008 года чалавечыя парэшткі са старых яўрэйскіх могілак, знойдзеныя падчас раскопак каля стадыёна ў Гомелі, былі перазахаваныя на іншых яўрэйскіх могілках. Для правядзення цырымоніі з Ізраіля прыязджаў равін. Прадстаўнікі мясцовых уладаў прысутнічалі на цырымоніі і дапамагалі яе арганізоўваць.
5 жніўня 2008 года ўрад прыняў закон, які забараняе любую рэкламу паслугаў, звязаных з “акультызмам”, у друкававых і электронных СМІ; хрысціянская супольнасць вітала гэты крок.

Частка 3. Шанаванне грамадствам свабоды веравызнання

Некаторыя прадстаўнікі грамадства імкнуліся садзейнічаць захаванню свабоды веравызнання, аднак у грамадстве былі адзначаныя выпадкі знявагі і дыскрымінацыі па рэлігійных перакананнях, па-ранейшаму існавалі праявы антысемітызму і негатыўнага стаўлення да суполак, што належаць да рэлігійных меншасцяў. Існавала шырока распаўсюджанае пераканне, што неа-нацысты адказныя за шматлікія акты вандалізму (асабліва тыя, аб’ектамі якіх былі яўрэйскія помнікі) і займаюцца дзейнасцю, скіраванай на распальванне рэлігійнай і этнічнай варожасці. На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, мясцовыя праваабаронцы па-ранейшаму выказвалі сур’ёзную занепакоенасць дзейнасцю «Русского национального единства» ў Наваполацку, якая праяўлялася сярод іншага ў актах вандалізму і нанясенні свастык на сцены будынкаў. У 2009 годзе гарадская пракуратура двойчы адмовілася расследаваць такія выпадкі на падставе таго, што папярэднія праверкі не прывялі да выяўлення падазраваных.
11 траўня 2009 года ў Наваполацку міліцыя абвінаваціла ў крадзяжы маладога чалавека, які падчас хрысціянскага кірмаша зрабіў спробу скрасці звон у праваслаўнай царквы.
З 28 красавіка па 9 траўня 2009 года вандалы пашкодзілі 39 магільных камянёў на Мінскіх могілках. 26 траўня міліцыя затрымала дваіх жыхароў Мінска і абвінаваціла іх у хуліганстве.
27 ліпеня 2008 года ў Магілёве была зробленая спроба падпалу дома пастара пратэстанцкай царквы “Слова для жыцця” Віктара Машароўскага. Гэта была чацвёртая спроба падпалу яго дома. Паводле паведамленняў, па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, расследаванне было скончана, і падпальшчыка асудзілі на тры гады пазбаўлення волі.
1 ліпеня 2008 года пасля таго, як у гістарычным дакументальным фільме на Першым нацыянальным канале прагучала сцверджанне пра “варожае” стаўленне грэка-каталіцкай царквы да беларускага насельніцтва, Гродненская грэка-каталіцкая суполка Маці Божай Фацімскай зрабіла заяву, абвяргаючы “міфы і савецкія ідэалагічныя клішэ” што да ролі грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі.
Некалькі яўрэйскіх культавых месцаў пацярпелі ад вандалізму цягам справаздачнага перыяду. 2 чэрвеня 2009 года ў Барысаве вандалы пашкодзілі 13 магільных камянёў на

старых яўрэйскіх могілках. Міліцыя распачала крымінальную справу, а мясцовая яўрэйская супольнасць заклікала мясцовыя ўлады да патрулявання могілак.
12 траўня 2009 года ў Мінску вандалы распылілі фарбу і нанеслі свастыкі на чатыры мемарыяльныя камяні, усталяваныя ў памяць пра нямецкіх яўрэяў, забітых на тэрыторыі Беларусі. Па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, расследаванне працягвалася.
9 траўня 2009 года ў Брэсце падчас святкаванняў Дня перамогі вандалы падпалілі вянкі і кветкі, ускладзеныя да мемарыялу ахвярам халакосту. Па стане на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, расследаванне працягвалася. З часу свайго ўсталявання ў 1992 годзе мемарыял шмат разоў станавіўся аб'ектам вандалізму.
22 красавіка 2009 года ў Віцебску на сцены сінагогі былі нанесеныя антысеміцкія надпісы і свастыкі. Яўрэйская суполка падала ў міліцыю заяву на ўзбуджэнне крымінальнай справы. За папярэднія напады на сінагогу ніхто з вандалаў не быў асуджаны.

Яўрэйская супольнасць па-ранейшаму выказвала занепакоенасць выкарыстаннем паняцця "больш шчыльны славянскі саюз", якое папулярна сярод нацыяналістычных арганізацый, што дзейнічаюць у краіне, у тым ліку сябраў «Русского национального единства» (РНЕ). Лідэры яўрэйскай супольнасці заклікалі ўлады да расследавання неа-нацысцкіх захадаў, прыводзілі новыя прыклады вандалізму, антысеміцкіх надпісаў і пагрозаў на адрас грамадзянскай супольнасці і рэгілійных суполак. У параўнанні з папярэднімі справаздачнымі перыядамі быў заўважаны некаторы рух наперад.

Шавіністкія і рускія ультранацыяналістычныя газеты і літаратуру, DVD і відэакасеты па-ранейшаму прадавалі ў "Праваслаўнай кнізе", што прадае праваслаўную літаратуру і рэлігійную атрыбутыку, але не звязаная з БПЦ. "Праваслаўная кніга" -- частка фірмы "Хрысціянская ініцыятыва", чый генеральны дырэктар часта піша ксенафобскія артыкулы. У "Праваслаўнай кнізе" рэгулярна можна было набыць некалькі антысеміцкіх выданняў, у тым ліку "Міфы і праўда пра пагромы" і "Тайны пратаколаў сіёнскіх мудрацоў: змова супраць Расіі" Алега Платонава, у якіх сцвярджаецца, што іудаізм варожы ў адносінах да рускай цывілізацыі і хрысціянства, што пагромы пачатку 20-га стагоддзя былі сіяністкай правакацыяй і што яўрэі забілі расійскіх уладароў і развязалі тэрор у савецкія часы.

На афіцыйным сайце БПЦ Гаўрыіл Беластоцкі, малалетняе дзіцё, нібыта забітае яўрэямі каля Гродна ў 1690 годзе, па-ранейшаму ўзгадваецца як святы і пакутнік. Паводле памінальнай малітвы, што чытаецца ва ўгодкі яго смерці, "мужны пакутнік Гаўрыіл выкрыў нячэснасць яўрэяў".
На працягу сваёй гісторыі Беларусь была і ёсць месцам як узаемадзеяння, так і супрацьстаяння беларускага праваслаўя і рымскага каталіцызму; на працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, адносіны паміж гэтымі дзвюма дэнамінацыямі палепшыліся. 27 красавіка 2009 года падчас сваёй сустрэчы з Папам Бенэдыктам XVI прэзідэнт Лукашэнка, паводле паведамленняў, высока ацаніў канструктыўнае ўзаемадзеянне і мірнае суіснаванне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў у Беларусі.

Частка 4. Палітыка ўрада ЗША

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам у межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека.

Супрацоўнікі амбасады падтрымлівалі сталыя сувязі з прадстаўнікамі рэлігійных груп, сустракаліся для абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання ў краіне з грамадзянамі ЗША розных веравызнанняў, якія жылі ў Беларусі або наведвалі яе. Супрацоўнікі амбасады наведалі некалькі імпрэзаў, што праводзіліся рэлігійнымі суполкамі, у тым ліку цырымоніі адкрыцця культавых помнікаў, а таксама семінары, прысвечаныя пытанням свабоды веравызнання і яе парушэнняў. Амбасада дэманстравала падтрымку свабоды веравызнання праз наведванне судоў над прадстаўнікамі рэлігійных суполак, што цярпелі ад пераследу па рэлігійных матывах. Урад Злучаных Штатаў выступаў з асуджэннем выпадкаў антысемітызму і рабіў захады, каб прадухіліць такія праявы, у тым ліку праз адсочванне паведамленняў пра выпадкі апаганьвання яўрэйскіх мемарыялаў і могілак. Амбасада звяртала ўвагу на продаж антысеміцкай і ксенафобскай літаратуры, што працягваецца ў крамах і ажыццяўляецца праз дзяржаўную сетку распаўсюду СМІ. Супрацоўнікі амбасады стала ўключалі наведванне культавых месцаў у праграму сваіх вандровак па краіне. Супрацоўнікі амбасады абмяркоўвалі пытанні свабоды веравызнання з прадстаўнікамі іншых замежных дыпламатычных місій, каб падтрымаць іх высілкі, скіраваныя на падтрымку свабоды веразвызнання.